# Навукова-практычны семінар “Ураджэнцы роднага краю”



Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва – адзін з удзельнікаў маштабнага сумеснага праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця", які Нацыянальная бібліятэка Беларусі ладзіць таксама з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і выдавецкім домам "Звязда" (часопіс "Маладосць", газета "Літаратура і мастацтва"). Праект прысвечаны 100-годдзю літаратурнага аб'яднання "Маладняк" (1923–1928) і ўжо багата прадстаўлены на сайце бібліятэкі. Пачынаючы з 2019 года, у межах праекта праходзілі круглыя сталы, выставы, літаратурныя конкурсы, адкрытыя лекцыі. А 3 лютага 2022 г. у Нацыянальнай бібліятэцы адбыўся навукова-практычны семінар "Ураджэнцы роднага краю", прысвечаны пісьменнікам-маладнякоўцам. Вёў мерапрыемства намеснік генеральнага дырэктара – дырэктар па навуковай рабоце, сацыякультурнай і выдавецкай дзейнасці бібліятэкі, кандыдат культуралогіі Аляксандр Суша.

Падчас семінара загадчык сектара аналітычнай інфармацыі па культуры і мастацтве Нацыянальнай бібліятэкі, магістр філалагічных навук Таццяна Лаўрык расказала пра дасягненні і планы віртуальнага праекта "На хвалі часу, у плыні жыцці" і прэзентавала новы раздзел, прысвечаны паэту Алесю Гурло (1892–1938), з выкарыстаннем у тым ліку матэрыялаў БДАМЛМ.

Акрамя гаспадароў мерапрыемства, у семінары ўзялі ўдзел даследчыкі літаратуры, музеязнаўцы, культуролагі, супрацоўнікі раённых і сельскіх бібліятэк краіны, а таксама сваякі пісьменнікаў-маладнякоўцаў: дачка Яна Скрыгана Галіна Скрыган і ўнучатая пляменніца Міколы Нікановіча Яўгенія Дзяркач. Размова ішла пераважна аб захаванні і ўшанаванні памяці пра выбітных творцаў (Алеся Гурло, Яна Скрыгана, Міхася Зарэцкага, Змітрака Бядулю, Уладзіміра Дубоўку, Кузьму Чорнага, Пятра Глебку, Петруся Броўку і іншых) на іх малой радзіме, у бібліятэчных, музейных, архіўных і адукацыйных установах.

Падсумоўваючы вынікі 2021 года, арганізатары праекта ўзнагародзілі ганаровымі граматамі яго актыўных удзельнікаў – Віктара Жыбуля (Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва) і Ігара Шаладонава (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі).

*4 лютага 2022 г.*